ПОСТАЦІ

В. В. Гарбачова

АРХІЎНАЯ СПАДЧЫНА ІГНАЦІЯ КЛЮКОЎСКАГА

Асоба Ігнація Клюкоўскага з'яўляецца амаль невядомай у айчыннай гістарыяграфіі. У даследчыцкай літаратуры да нядаўняга часу ён узгадваўся як адзін з дзеячаў паўстання 1831 г. і аўтар невялікага фрагмента аб ашмянскім выступленні. Зацікаўленасць лёсам гэтага чалавека паўстала ў нас пасля знаходкі ў Музеі Адама Міцкевіча ў Парыжы яго ўспамінаў. Адсутнасць канцоўкі ў гэтым рукапісе, а таксама літаратурныя здольнасці яго аўтара, падштурхнулі нас да далейшых пошукаў. І архіўныя знаходкі не прымусілі сябе доўга чакаць. Знойдзеныя намі матэрыялы з'яўляюцца яскравым сведчаннем таго, што ў эміграцыі ён сфарміраваўся як мастак і мастацтвазнавец.

Вышэйшую адукацыю Ігнацій Клюкоўскі атрымаў у Віленскім універсітэце. У 1819 г. ён стаў студэнтам так званай Школы прыгожых мастацтваў, якая з 1803 г. уваходзіла ў склад аддзялення (факультэта) літаратуры і вольных мастацтваў [20, s. 201; 4, s. 113]. Першая чвэрць XIX ст., калі школа знаходзілася пад кіраўніцтвам Яна Рустэма, які прыкладаў шмат намаганняў для яе развіцця, стала перыядам станаўлення гэтай установы. У справаздачах універсітэта за 1816 г. адзначаецца, што студэнты атрымалі магчымасць малявання алеем, для практычных заняткаў набываліся гіпсавыя копіі антычных статуй, акрамя гэтага пачынаецца маляванне з жывой мадэлі, і ў штаце з'яўляецца натуршчык. Аднак новаўвядзенні яшчэ не адыгрывалі ў мастацкай школе той ролі, на якую спадзяваўся Рустэм, ды і былі яны, па вялікім рахунку, не настолькі істотныя, каб адпавядаць еўрапейскім патрабаванням [34, s. 113]. Так, у якасці натуршчыка на працягу васьмі гадоў працаваў усяго адзін чалавек, да таго ж, па ўспамінах былых студэнтаў, ён меў далёкія ад ідэальных прапорцыі цела. Свае функцыі ўзгаданы натуршчык выконваў з 1817 па 1831 г. з перапынкам па хваробе ў 1822—1828 гг. [4, s. 119—120]. Працаваць студэнтам прыходзілася ў не прыстасаваных для заняткаў мастацтвам памяшканнях, пры адсутнасці добрага асвятлення. Мастацкая адукацыя мела яшчэ і досыць абмежаваны характар на ўзроўні тэарэтычнай падрыхтоўкі. Так, лекцыі па тэорыі мастацтва чыталіся толькі Джозефам Сандэрсам на працягу 1810—1817 гг. Пасля яго ад'езду лекцыі прыпыніліся і ўжо не аднаўляліся [31, s. 360—361].

Рустэму належала таксама ініцыятыва правядзення ў Вільні мастацкіх выстаў з удзелам студэнтаў універсітэта. Першая з іх адбылася 15 чэрвеня 1820 г. Па сведчанні сучаснікаў, мэтай яе правядзення было імкненне прыцягнуць здольную моладзь да заняткаў мастацтвам [31, s. 361]. На выставе 23 удзельнікі прадставілі 136 карцін, эскізаў і гравюр, сярод якіх былі работы Валенція Ваньковіча, Вінцэнта Смакоўскага, Багуміла Кіслінга, Караля Рачынскага, Марціна Янушэвіча і інш. Удзельнікамі выставы сталі і два сябра з дзяцінства — Эдвард Ромер, які з'яўляўся вольным наведвальнікам заняткаў Рустэма, і студэнт другога года навучання Ігнацій Клюкоўскі [6, s. 742—743; 21, s. 633].

Рэакцыя грамадскасці на правядзенне выставы стала неспадзяванай для яе арганізатараў [36, s. 3]. Па-першае, публікай на першае месца былі пастаўлены работы Кануты Русецкага, Ежы Вярэцкага, Мацея Прыбыльскага, Яна Шольмы, Рачынскага і Смакоўскага. На другое месца трапілі Станіслаў Хамінскі, Казімір Кавальскі і Ромер. У прэсе з'явілася некалькі ананімных публікацый, прысвечаных правядзенню выставы і дзейнасці самой віленскай школы [31, 38, 40], дзе падкрэслівалася, што яна не спраўдзіла спадзяванняў грамадскасці.

Ігнацій Клюкоўскі прадставіў на віленскай выставе 18 эскізаў, а таксама маляваныя мелам галовы св. Паўла і св. Магдалены [6, s. 749; 31, s. 368]. Яго работы засталіся не заўважанымі крытыкамі, і ў лік падаючых надзею малады мастак не трапіў. Трэба адзначыць, што адпаведны лёс напаткаў не толькі Клюкоўскага. Так, рэакцыя на работы Ваньковіча была ўвогуле нечаканай, яны падвергліся досыць жорсткай крытыцы [6, s. 743]. І тым не менш пачатак новаму напрамку ў мастацкім жыцці Вільна быў пакладзены. Пачынаючы з 1820 г. выставы сталі праводзіцца кожныя два гады [36, s. 12].

Пасля заканчэння ў 1826 г. універсітэта Клюкоўскі намерваўся працягваць далейшае навучанне ў Італіі, аднак здзейсніць гэта не ўдалося, і ён паступіў на працу ў канцылярыю Радзівілаўскай камісіі. А пасля актыўнага ўдзелу ў паўстанні ў 1831 г. Клюкоўскаму, каб не трапіць пад рэпрэсіі за дзеянні супраць улады са зброяй у руках, нічога не заставалася, як эмігрыраваць [1, 23, 24, 35, 41].

У кастрычніку 1831 г. Клюкоўскі разам з адступіўшымі часткамі паўстанцкай арміі ў таварыстве Валяр'яна Пяткевіча, Севярына Галянжоўскага і ваяводы Антонія Астроўскага апынуўся ў Прусіі [1, s. 82], адкуль пасля атрымання прускага пашпарта праз Торунь, затым Вроцлаў перабраўся ў Галіцыю, дзе ён правёў дзесяць месяцаў. Апынуўшыся ў Галіцыі, Клюкоўскі вяртаецца да сваіх цывільных заняткаў — пачынае займацца мастацтвам. Як пісаў ён пазней у сваіх успамінах, што «ніколі не быў прыхільнікам вайсковасці» і «пасля працяглых ваенных цяжкасцей і нягод» Клюкоўскі, узяўшы мальберт, пачаў рабіць замалёўкі навакольных краявідаў [2, s. 67]. Магчыма, такім чынам ім рабілася спроба асэнсавання таго, што адбылося ў яго жыцці. На гэтых малюнках самотны путнік паўстае на фоне бязмежнай прасторы Ленскароны і Кальварыі. Ад часу знаходжання Клюкоўскага ў Галіцыі захаваліся дзве літаграфіі, якія выканаў August François Alès [7, s. 22; 25, po s. 191, 193; 11, s. 555]. Адзначаныя літаграфіі былі выдадзены Леанардам Ходзькам у 1837 г. З часоў Галіцыі Клюкоўскі пачынае таксама збіраць матэрыялы па тэорыі і гісторыі сусветнага мастацтва [15, s. 192].

У жніўні 1832 г. Клюкоўскі трапіў у Францыю. Пачаткова ён апынуўся ў эміграцкім закладзе ў Буржэ [5, s. 117; 37, s. 295], адкуль нелегальна пера-

браўся ў Парыж. Можна меркаваць, што ў Парыжы Клюкоўскі апынуўся дзесьці ў канцы кастрычніка і прабыў там да вясны 1833 г. Адсутнасць сродкаў для існавання падштурхоўвала многіх эмігрантаў накіроўваць свае намаганні на далейшы працяг адукацыі. Клюкоўскі, карыстаючыся дапамогай Таварыства навуковай дапамогі, распачынае вывучэнне вайсковай тапаграфіі. Аднак у сакавіку 1833 г., не атрымаўшы афіцыйнай згоды на знаходжанне ў сталіцы, Клюкоўскі вымушаны быў перабрацца ў Манпелье [32, s. 58].

З канца 1836 — пачатку 1837 г. Клюкоўскі паўторна пасяляецца ў Парыжы і аднаўляе свае заняткі жывапісам. Як сведчылі яго сябры, ён выязджаў маляваць з натуры ў Бардо, Руан, пастаянна маляваў у Парыжы і яго прадмесцях. Адначасова з гэтым мастак сістэматычна наведваў музеі і рабіў нататкі па гісторыі мастацтва. З мастацкіх твораў гэтага перыяду захаваўся толькі адзін малюнак, які, па сведчанні Анджэя Банаха, быў выкарыстаны пры афармленні вокладкі паэтычнага зборніка Богдана Залескага [39]. Складанае эміграцкае жыццё вымушала мастака шукаць іншыя сродкі для існавання. У гэтых абставінах Клюкоўскі вымушаны быў займацца размалёўкай гравюр, працаваў у артыстычна-рамесных майстэрнях, дзе займаўся нанясеннем узораў на тканіну [8, s. 338—339; 22, s. 29].

Відавочна, што незадаволенасць сваім становішчам, як у творчым плане, так, відаць, і ў матэрыяльным, пэўным чынам паўплывала на тое, што Клюкоўскі зноў вырашае апрануць вайсковую вопратку і падтрымаць заклік Адама Міцкевіча па стварэнні італьянскага легіёна. У маі 1848 г. ён накіроўваецца на чале атрада добраахвотнікаў у Мілан і знаходзіцца ў Італіі да мая 1849 г. У гэты перыяд Клюкоўскі ўдзельнічаў у распрацоўцы формы для легіянераў, а таксама выявы арла для галаўнога ўбору [22, s. 29]. Веданне Клюкоўскім італьянскай мовы стала падставай для выкарыстання яго ведаў у канцылярскай працы і вызваліла ад удзелу ў баявых дзеяннях.

Пасля вяртання ў маі 1849 г. у Парыж становішча Клюкоўскага яшчэ больш ускладнілася. Абумоўлена гэта было тым, што з канца 40-х гг. XIX ст. яго папярэднія заняткі перасталі карыстацца сярод французаў попытам, і з гэтага часу ён быў вымушаны шукаць іншую працу, якая прыносіла б пастаянны прыбытак. Клюкоўскі перабіраецца ў Баціньёль і ўладкоўваецца на працу ў чыгуначныя майстэрні [32, s. 58].

Апошнія два гады свайго жыцця Клюкоўскі правёў у Парыжы. Тут ён уладкаваўся ў бюро Таварыства дабрачыннасці польскіх дам, дзе прапрацаваў да 25 снежня 1861 г. Нельга сцвярджаць, што гэтая праца задавальняла Клюкоўскага, але, як ён сам пазначаў, «заўсёды была (для яго. — *В. Г.*) нейкай дапамогай» [1, s. 92]. Пасля звальнення з працы Клюкоўскі апынуўся, па сутнасці, без сродкаў для існавання, да таго ж ён захварэў на сухоты. У складаных жыццёвых абставінах на дапамогу прыйшлі Эдвард Ромер, які падтрымліваў сябра фінансава, і Яўстафій Янушкевіч. Па пратэкцыі Янушкевіча Клюкоўскаму ўдалося ўладкавацца на часовую працу, якая заключа-

лася ў перапісцы папер па польскай гісторыі і давала магчымасць на сціплае існаванне: «За пяць дзён працы зарабіў 8 франкаў і 25 цэнтаў… Аднак з вяртаннем Яўстафія (Янушкевіча. — *В. Г.*) з Турына маю надзею, што ўсё будзе адбывацца лепей, а можа нават будзе карысным для мяне, як у гэтым запэўніваюць мяне льсцівымі камплементамі» [13, s. 163]. Для параўнання, Юзаф Патрыкоўскі пісаў, што памер першай дапамогі, выдадзенай яму на пяць дзён, склаў 6 франкаў і 5 су [33, s. 97].

Менавіта ў гэты перыяд свайго жыцця Клюкоўскі распачынае ўпарадкаванне сабранага ім на працягу апошніх 30—40 гадоў матэрыялу па гісторыі сусветнага мастацтва. Пачаткова гэтая работа праводзілася выключна ў асабістых інтарэсах і заключалася ў асноўным у зборы матэрыялу шляхам наведвання мастацкіх галерэй, чытання кніг і г. д. Дзесьці ў сярэдзіне 50-х гг. XIX ст. Клюкоўскі прыступае да першаснага асэнсавання назапашанага матэрыялу і складае на яго падставе чарнавыя варыянты храналагічных табліц [15, s. 191]. А пасля выпадковай сустрэчы Клюкоўскага ў 1861 г. з Эдвардам Ромерам і ўзнікшай паміж імі перапісцы, з'яўляюцца даследаванні — «Лісты аб мастацтве да Эдварда Ромера», «Думкі і гістарычныя нататкі аб мастацтве» і няскончаны нарыс аб мастацтве «Гістарычныя часы».

Пакуль складана адказаць на пытанне, хто ініцыіраваў напісанне гэтых прац. Аднак можна пазначыць, што зацікаўленасць да прац Клюкоўскага выказвалі абодва яго сябра — Эдвард Ромер і Браніслаў Залескі, з якімі Клюкоўскі распачаў перапіску па просьбе Ромера. Сваю працу «Думкі і гістарычныя нататкі аб мастацтве» Клюкоўскі прысвяціў абодвум сябрам і даў дазвол на выкарыстанне сваіх прац: «Рабіце (з маімі працамі. — *В. Г.*) што пажадаеце, толькі ніколі не выкарыстоўвайце на карысць дылетантаў» [14, s. 338; 17, s. 303]. На жаль, гэтае даследаванне, прысвечанае тэорыі і гісторыі мастацтва, Клюкоўскі не паспеў скончыць. Напачатку красавіка 1862 г. перапіска паміж сябрамі з-за абвастрэння хваробы ў Клюкоўскага прыпынілася. Апошнія яго лісты да Залескага і Ромера датаваны 3—5 красавіка 1862 г. [2, s. 99, 387]. А 30 траўня 1862 г. Ігнацій Клюкоўскі памёр у шпіталі для маламаёмасных і 1 чэрвеня быў пахаваны на парыжскіх могілках Манмартра [9, s. 38 v.—56]. Пасля пахавання прысутныя дамовіліся, што са шпіталя яго рэчы забярэ Караль Песляк, а затым накіруе да Фелікса Вратноўскага. Як узгадвае апошні, кнігі і мастацкія зборы Клюкоўскага апынуліся ў яго толькі дзесьці ў канцы 1862 — пачатку 1863 г. [10, s. 22—23, 156]. У лютым 1867 г. Люцыян Вейсенгоф звярнуўся да Вратноўскага з просьбай даслаць яму мастацкія творы Клюкоўскага. Вратноўскі паўторна прагледзеў зборы свайго сябра і выслаў патрэбныя рукапісы ў Дрэздэн у траўні 1867 г. [10, s. 172, 190].

Два з мастацтвазнаўчых рукапісаў Ігнація Клюкоўскага на сённяшні дзень захоўваюцца ў Бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве. Хутчэй за ўсё пасля Вейсенгофа яны трапілі да Браніслава Залескага, а надалей разам з іншай спадчынай апошняга перайшлі ў архіў Атэля Ламберт, частка якога пазней

была перададзена ў Кракаў. Трэці з рукапісаў Клюкоўскага, вядомы даследчыкам толькі сваёй назвай, можа знаходзіцца ў паперах Ромераў у Вільна.

Рукапісы Клюкоўскага па тэорыі і гісторыі мастацтва з'яўляюцца састаўной часткай яго перапіскі, якую ён веў з Эдвардам Ромерам і Браніславам Залескім у 1861—1862 гг., і знаходзяцца ў адной справе [2]. Сама гэтая справа складаецца з дзвюх частак, якія маюць асобную ўнутраную пагінацыю. Першая частка пад назвай «Лісты Ігнація Клюкоўскага аб мастацтве ад 1861 да 1862 года, адрасаваныя Эдварду Ромеру» складаецца са 105 старонак і ўтрымлівае 20 лістоў, напісаных Клюкоўскім у Парыжы з 11 ліпеня 1861 па 5 красавіка 1862 г. і адрасаваных Ромеру ў Лукіні (маёнтак Вількамірскага павета). Большасць з лістоў змяшчае апісанне прыватных спраў. У той жа момант тут утрымліваецца пяць лістоў, прысвечаных мастацтву (шосты ліст, які павінен быў знаходзіцца ў якасці дадатку да ліста Клюкоўскага ад 25 верасня 1861 г., што пазначаецца самім аўтарам, у справе адсутнічае) [26—30].

Асноўная тэма, разглядаемая Клюкоўскім у лістах да Эдварда Ромера, гэта лёс мастацтва ў XIX ст. На старонках лістоў разглядаюцца прычыны заняпаду мастацтва ў XIX ст., адлюстроўваецца ўклад у сусветнае мастацтва розных народаў, а таксама канкрэтных мастакоў. Відавочна, што Клюкоўскі знаходзіўся пад моцным уплывам рамантызму і жывапісу свайго сучасніка, нямецкага мастака, лідэра аб'яднання «назарэйцаў» Іагана Фрыдрыха Авербека. Імкненне гэтага мастака адрадзіць рэлігійныя ідэалы рэнесанснага мастацтва і выступленне супраць акадэмізму, заснаванага на эклектычным засваенні і капіраванні прынятых узораў, шчыра падтрымліваліся Клюкоўскім. Ён, прызнаваючы унікальнасць і непаўторнасць Фра Анджэліка і Рафаэля, спрабуе прасачыць іх уплыў на мастакоў XIX ст., асабліва на Фрыдрыха Авербека.

Другая частка разглядаемай справы пад назвай «Ігнацій Клюкоўскі да Браніслава Залескага, 1861—1862» складаецца з 398 старонак і ўтрымлівае 41 ліст, напісаныя Клюкоўскім на працягу 7 лістапада 1861 г. — 8 красавіка 1862 г. да Залескага. Ужо ў першым лісце да Браніслава Залескага Клюкоўскі вызначае метады даследавання мастацтва і яго месца ў гісторыі культуры і дае назву свайму твору — «Думкі і гістарычныя нататкі аб мастацтве» [19, s. 4]. Знойдзены намі рукапіс з'яўляецца першым варыянтам даследавання, якое Клюкоўскі меркаваў у будучым, калі «час і здароўе дазволяць», дапрацаваць [15, s. 197].

Пачаткова Клюкоўскі планаваў у сваім нарысе прааналізаваць мастацтва Старажытнага Усходу (Індыя, Егіпет, Асірыя, Іудзея), эпохі антычнасці і скончыць хрысціянскім мастацтвам [15, s. 192]. Аднак не паспеў давесці гэтага да канца. З запланаванага Клюкоўскі паспеў даслаць Залескаму толькі апісанне ўсходняга мастацтва, дадаўшы ў свой нарыс матэрыял па Персіі і Фінікіі [16], і пачатак другой часткі «Эра грэка-рымскага свету» пад назвай «Гістарычны погляд на мастацтва Грэцыі» [18]. Да раздзела па гісторыі егіпецкага мастацтва далучана храналагічная табліца,

складзеная на падставе выкарыстання аўтарам найноўшых даных французскіх, нямецкіх і англійскіх егіптолагаў XIX ст.

Матэрыял гэтага раздзела пэўным чынам адрозніваецца ад таго, што ўтрымліваецца ў лістах да Ромера. У большасці нарыс складаецца з асобных лістоў, якія дадаваліся Клюкоўскім да звычайных лістоў, адрасаваных Залескаму. У некаторых выпадках запісы, якія тычацца мастацтва, устаўляюцца аўтарам у агульныя лісты. Аднак у адрозненне ад папярэдняй гэтая частка ўспрымаецца як самастойнае і цэласнае даследаванне.

Трэба адзначыць, што для ўдасканалення свайго майстэрства Ігнацій Клюкоўскі прыкладаў намаганні на працягу ўсяго свайго жыцця. Узровень мастацкай адукацыі, атрыманы ім ва універсітэце, выпрацаваў у ім прагу да ўдасканалення навыкаў і паглыблення ведаў. Ён увесь час імкнуўся да малявання з натуры, разумеючы неабходнасць гэтых заняткаў для мастака. А пачатковыя самаадукацыйныя заняткі майстра, якія распачаліся з наведвання музеяў, паступова пераўтварыліся ў даследчыцкую працу, вынікам якой з'явілася напісанне прац па гісторыі і тэорыі мастацтва, заснаваных на найноўшых еўрапейскіх навуковых дасягненнях у галіне мастацтва і археалогіі.

Крыніцы і літаратура

1. За вольнасць і веру. Ігнацій Клюкоўскі і яго ўспаміны аб падзеях паўстання 1830—1831 гадоў: На польскай і беларускай мовах / Уклад., перакл., камент. В. В. Гарбачовай. Мінск, 2007. 120 с.
2. Archiwum Hotelu Lambert. Bronislaw Zaleski. Korespondencja. Listy o sztuce Ignacego Klukowskiego. W części adresowane Edwarda Romera // Biblioteka książat Czartoryskich w Krakowie (B. Czart). Rkps 6944 II.
3. Banach A. Polska książka ilustrowana. 1800—1900. Kraków, 1959. 508 s.
4. Bartnicka K. Polske szkolnictwo artystyczne na przełomie XVIII i XIX w. (1764—1831). Wrocław, 1971. 281 s.
5. Bielecki R. Zarys rozproszenia Wielkiej Emigracji we Francji 1831—1837. Materiały z archiwów francuskich. Warszawa—Łódź, 1986. 368 s.
6. Bieliński J. Uniwersytet Wileński (1579—1831): w 3 t. Kraków, 1900. T. 2. 842 s.
7. Dréma V., Melbechowska-Luty A. Klukowski Ignacy // Słownik artystów polskich. Wrocław, 1986. T. 4. S. 22—23.
8. F. W. Klukowski Ignacy. Zmarli na wychodztwie od 1861 roku // Rocznik Towarzystwa Historyczno-Literackiego w Paryżu. Rok 1866. Paryż, 1867. S. 338—339.
9. Felixs Wrotnowski. Pamiętnik. T. 1. Styczeń 1856 — wrzesień 1862 // Muzeum Adama Mickiewicza (MAM). Rkps 1025.
10. Felixs Wrotnowski. Pamiętnik. T. 2. Październik 1862 — maj 1870 // MAM. Rkps 1025.
11. Gumowski M. Klukowski Ignacy // Allgemeines Lexikon der bildenden Künstler von der Antike bis zur Gegenwart, Bd 1—37 / U. Theime, F. Becker. Leipzig, 1927. T. 20. S. 555.
12. Ignacy Klukowski do Bronisława Zaleskiego, 1861—1862. List z 12 grudnia 1861 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 91—100.
13. Ignacy Klukowski do Bronisława Zaleskiego, 1861—1862. List z 12 stycznia 1862 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 163—166.

14. Ignacy Klukowski do Bronisława Zaleskiego, 1861—1862. List z 14 marca 1862 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 323—338.
15. Ignacy Klukowski do Bronisława Zaleskiego, 1861—1862. List z 21 stycznia 1862, wieczór // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 191—198.
16. Ignacy Klukowski do Bronisława Zaleskiego, 1861—1862. List z 25 lutego 1862 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 283—296.
17. Ignacy Klukowski do Bronisława Zaleskiego, 1861—1862. List z 3 marca 1862 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 303—314.
18. Ignacy Klukowski do Bronisława Zaleskiego, 1861—1862. List z 31 marca 1862 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 373—380.
19. Ignacy Klukowski do Bronisława Zaleskiego, 1861—1862. List z 7 listopada 1861 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 1—4.
20. Janowski L. Słownik bio-bibliograficzny dawnego Uniwersytetu Wileńskiego. Wilno, 1939. 527 s.
21. Kamolowa D. Romer Edward // Polski słownik biograficzny. Wrocław—Warszawa—Kraków, 1988. T. 31. S. 633—635.
22. Kieniewicz S. Klukowski Ignacy // Polski słownik biograficzny. Wrocław—Warszawa—Kraków, 1967. T. 13. S. 28—29.
23. Klukowski J. Powstanie powiatu oszmiańskiego // Zbiór pamiętników o powstaniu Litwy w r. 1831 / Ukł. przez F. Wrotnowskiego. Paryż, 1835. S. 229—249.
24. Klukowski J. W powiecie oszmiańskim // Powstanie 1831 roku na Litwie. Wspomnienia uczestników / wyd. H. Mościcki. Wilno, 1931. S. 96—106.
25. La Pologne historique, littéraire, monumentale et pitoresque / red. L. Chodźko. Paryż, 1837. T. 2. 427 s.
26. Listy Ignacy Klukowski o sztuce od 1861 do 1862 do Edwarda Romera. List z 23 września 1861 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 29—40.
27. Listy Ignacy Klukowski o sztuce od 1861 do 1862 do Edwarda Romera. List trzeci o sztukach. Paryż, 26 września 1861 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 51—54.
28. Listy Ignacy Klukowski o sztuce od 1861 do 1862 do Edwarda Romera. List z 27 września 1861 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 55—58.
29. Listy Ignacy Klukowski o sztuce od 1861 do 1862 do Edwarda Romera. List z 29 września 1861 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 59—66.
30. Listy Ignacy Klukowski o sztuce od 1861 do 1862 do Edwarda Romera. List z 1 października 1861 // B. Czart. Rkps 6944 II. S. 67—74.
31. Pierwsze wystawienie dzieł sztuk pięknych w cesarskim Uniwersytecie Wileńskim // Dziennik Wileński. 1820. T. 2. S. 360—368.
32. Polacy pochowani na cmentarzu Montmartre oraz Saint-Vincent i Batignolies w Paryżu / R. Bielecki [et al.]; pod red. A. Biernata, S. Góżyńskiego. Warszawa, 1999. 328 s.
33. Potrykowski J. Tułactwo Polaków we Francji. Dziennik emigranta. Kraków, 1974. Cz. 1. 277 s.
34. Romer A. Do dziejów wileńskiej szkoły sztuk pięknych // Sprawozdania Komisji do Badań Historii sztuki w Polsce. Kraków, 1896. T. 5. S. XIV—XVI.
35. Szczerbicki E. Rok 1831 w powiecie oszmiańskim // Rocznik Gimnazjum w Oszmianie. Rok szkolny 1926/1927. 1926. S. 3—60.
36. Tatarkiewicz W. O wileńskiej szkole malarstwa // Południe. 1921/1922. Z. 1. S. 1—18.

37. Tyrowicz M. Towarzystwo Demokratyczne Polskie 1832—1863. Przywódcy i kadry członkowskie. Przewodnik bio-bibliograficzny. Warszawa, 1964. 871 s.
38. Uwagi nad artykułem «Pierwsze wystawienie dzieł sztuk pięknych w cesarskim Uniwersytecie Wileńskim» umieszczonym w «Dzienniku Wileńskim» // Tygodnik Wileński. 1820. T. X. S. 147—155, 174—185.
39. Zaleski B. J. Poezje. Lwów, 1838. 140 s.
40. Zastawienie się nad uwagami w «Tygodniku Wileńskim» umieszczonymi (o wystawieniu dzieł sztuk pięknych) // Tygodnik Wileński. 1820. T. X. S. 209—224, 233—242.
41. Zienkowicz J. Powstanie powiatu oszmiańskiego // Pamiętniki polskie: w 4 t. / wyd. K. Bronikowski. Przemyśl, 1884. T. 2. S. 7—47.

— ◇ —

Я. К. Анішчанка

ДА БІЯГРАФІІ ГІСТОРЫКА ВАСІЛЯ УЛАНАВА

Васіль Уланаў адносіцца да тых малавядомых рускіх гісторыкаў, пра якіх у свой час доўга замоўчвалі, але якія першымі праклалі шляхі навуковага вывучэння беларускай даўніны [1]. Новыя архіўныя звесткі дазваляюць зараз больш упэўнена меркаваць пра яго жыццёвыя пуцявіны.

Найбольш падрабязна аб сабе сам Уланаў апавядаў 18 жніўня 1916 г., калі быў памочнікам члена вучылішчнага аддзялення Маскоўскай гарадской управы. Тады ж ён склаў спіс сваіх прац і кароткую аўтабіяграфію [2].

Згодна з выпіскай з Курскай духоўнай кансісторыі В. Уланаў нарадзіўся 12 красавіка 1882 г. і быў ахрышчаны праз 3 дні ў Іакімаўскай царкве сяла Доўгае Курскага павета, дзе часова пражывала яго маці, курская мяшчанка Агаф'я Філіпаўна Таржэўская [3]. 8 ліпеня 1903 г. ён быў запісаны ў курскае мяшчанскае саслоўе і праз тыдзень падаў хадайніцтва рэктару Маскоўскага універсітэта аб сваім жаданні навучацца на гісторыка-філалагічным аддзяленні універсітэта [4]. У лісце гаварылася, што В. Уланаў вучыўся 4 гады ў духоўнай семінарыі, дзе з 17 мая па 8 чэрвеня 1902 г. «подвергался испытанию зрелости по курсу гимназии и показал результаты по Закону божию отлично, хорошо по истории, удовлетворительно по русскому и церковно-славянскому языку, логике, французскому, латинскому и греческому языкам, математике, физике, географии» [5]. Адразу пасля семінарыі, 21 мая 1903 г., В. Уланаў павянчаўся з дачкой папа Нікольскай царквы слабады Каменная Яруга Зміеўскага павета Курскай губерні Марыянілай Іванаўнай Паповай.

У жніўні 1903 г. ён паступіў на жаданае аддзяленне Маскоўскага універсітэта і даў пісьмовае заручэнне «не принимать участия ни в каких сообществах, как, например, в землячествах и тому подобных, а равно не вступать даже в дозволенные законом общества без разрешения на то в каждом отдельном случае ближайшего начальства» [6]. Гэту падпіску Уланаў у наступным выконваў няўхільна. Маючы ад курскай губернскай земскай управы пазыку ў 50 руб., ён унёс яе палову за слуханне лекцый па грэчаскай і рымскай гісторыі, гісторыі сярэдніх вякоў, царквы, новай і рускай гісторыі, гісторыі Усходу, Візантыі і славян, логіцы, псіхалогіі, гісторыі старажытнай і новай філасофіі,